# КЛАСІФІКАЦЫЯ ПЛАСЦІНІСТЫХ БРАНЗАЛЕТАЎ З ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (IV СТ. ДА Н. Э. – VIII СТ. Н. Э.)

**М. В. Балыш**

Пры стварэнні класіфікацыі за аснову была ўзята такая характарыстыка, як сячэнне пласцінкі, адпаведна, з якіх выраблялісяўпрыгожванні. Пры гэтым улічвалася сячэнне не толькі самога стрыжню, але завяршэнне бранзалетаў. Такім чынам наступная тыпалогія бранзалетаў жалезнага веку заснавана, у першую чаргу на марфалагічным прызнаку, як, у прынцыпе, і большасць класіфікацый і тыпалогій для асобных культур, якія былі выкарыстаны.

**Тып 1.** Гладкія пласціністыя бранзалеты. Упрыгожванні прадстаўляюць сабою вузкія доўгія роўныя па шырыні на ўсім сваім працягу пласціны, якія загіналіся ў форме аднаабаротных бранзалетаў. У жалезным веку першай культурай на тэрыторыі Беларусі, у якой мы знаходзім падобныя вырабы, была мілаградская. З'яўленне такіх вырабаў сярод носьбітаў мілаградскай культуры звязана, у першую чаргу, з паўднёвымі ўплывамі. На скіфскіх помніках аналагічныя ўпрыгожанні атрымалі шырокае распаўсюджанне ў 4–3 стст. да н. э. [14, с.57, табл.43:18]. Зафіксаваны аналагічныя вырабы і на познезарубінецкіх помніках. На могільніку кан. 1–3 стст. н. э. Рахны было знойдзена некалькі такіх вырабаў [9, с.131]. Ужыванне дадзеных упрыгожванняў працягвалася пачынаючы з другой чвэрці на працягу усяго 1 тыс. н. э. Гэтым часам датуюцца вырабы з гарадзішчаў Гарадзішча, Краснае, Кублічы, Цясты [10, с.33–34, мал.5:4; 12, с.112, рис.58:22; 16, с.65, Табл.3/II,1,9,10; 17, с.69, мал.42:10]. Аналогіі гэтым бранзалетам знойдзены на тэрыторыі Смаленшчыны; таксама падобныя вырабы сустракаюцца ў Латвіі і Эстоніі ў 3–6 стст. [12, с.112, рис.58:22].

**Тып 2.** Пласціністыя бранзалеты з вузкім рабром на знешняй паверхні. Варыянт 1. Выраблялiся такія бранзалеты з вузкіх пласцін, на якіх са знешняга боку зроблена вузкае рабро. Захавалася два вырабы. Адзін цэлы экземпляр быў знойдзены на селішчы Мікольцы. Абломак такога ж бранзалета паходзіць з селішча банцараўскай культуры ля в. Равячка. Варыянт 2. Асаблівасць такіх упрыгожванняў у тым, што шырыня пласціны, з якой яны выраблялiся, складала 1,5см, а колькасць рэбраў-выступаў дасягала пяці. Фактычна уся знешняя паверхня была цалкам у выступах. Такім быў адзін выраб з селішча Мікольцы [6, с.103–104, мал.68:16].

А.М. Мядзведзеў датуе фрагмент з Равячкі не раней за другую палову 5 ст. н. э. [10, с.29, рис.43:4]. Такія ж бранзалеты былі знойдзены ў адным з курганаў ля в. Цыгелья (Літва; культура паўднёвалітоўскіх курганоў) у комплексе з касцяным грэбенем і В-падобнымі рыфлёнымі спражкамі, што дазваляе датаваць комплекс другой паловай 5 ст. н. э. [3, с.32–33, рис.2:41]. Сустракаюцца такія бранзалеты і на могільніках ліваў і ў земгалаў, якія датуюцца 5–8 стст. н. э. А значыць і датаваць гэты тып бранзалетаў неабходна другой паловай 5–8 стст. н. э.

**Тып 3.** Шырокія бранзалеты з кропкавым арнаментам. Адзін экземпляр разглядаемага тыпу быў выяўлены на гарадзішчы Збаравічы. Упрыгожванне выраблена з тонкай (0,1см) бронзавай пласціны, максімальная шырыня пласціны 1,6см; адзін канец бранзалета абламаны, другі – моцна звужаны – адагнуты вонкі і ўтварае кручок, вонкавы бок пласціны арнаментаваны па краях размешчанымі ў адзін рад кропкамі.

Гарадзішча Збаравічы з'яўляецца аднаслойным і жыццё на ім працягвалася адносна нядоўга. На думку Я.Г. Звяругі жыццё існавала на ім у 1–4 стст. н. э. [6, с.23]. Такім чынам разглядаемае ўпрыгожванне не можа храналагічна выходзіць за гэтыя межы.

Аналагічных вырабаў больш не выяўлена [6, с.14, мал.7:11].

**Тып 4.** Бранзалеты з зааморфным завяршэннем. З беларускіх помнікаў паходзіць толькі адзін выраб. Знойдзены ён быў на могільніку вельбарскай культуры Брэст-Трышын [7, с.6,7,49,50, рис.10, табл. VII,7,ж]. Дадзены экземпляр быў выраблены са срэбра і захаваўся фрагментарна. Ю.В. Кухаренка аднёс такія вырабы да ніжневісленскага, ці, як іх называе Блюме, усходнегерманскага, тыпу – па класіфікацыі Е. Кмецінскага (К-1), знаходкі экземпляраў якога сустракаюцца ў Ніжнім Павіслі і на Памор'і, Мазовіі, спарадычна ў Велікапольшы [7, с.50, рис.10]. Найбольш дакладныя аналогіі вядомы з могільніка Неданава, дзе было знойдзена некалькі фрагментаваных і два цэлых. Большасць знаходак з гэтага помніка адносяцца да фазы B2/C1-C1a, і толькі адзін можа мець ніжнюю мяжу ужывання фазай B1b [2, s.30, taf.XXXVI/125:3; s.54, taf.XC/272:3; s.71, taf.CXXXVI/373:1; s.99, taf.CCIII/569:4; s.104, taf.CCXV/608:2].

Адзінкавыя вырабы выяўлены ў Цэнтральнай Еўропе. Датуюцца яны там 1–2 стст. н.э., прычым ў канцы з'ўляліся вялікаю рэдкасцю.

На падставе аналогій можна сцвярджаць, што разглядаемы тып упрыгожванняў характэрны для перыяду сяр. 1–2 стст. н. э.

**Тып 5.** Полыя шырокія бранзалеты з васьмеркападобным арнаментам. Знешняя паверхня такіх упрыгожванняў складалася з асобных злучаных

паміж сабою васьмёркападобных супрацьлегла завернутых спіралей, адлітых на тонкай бронзавай пласціне – аснове [11, с.80, рис.34:6].

Блізкія аналогіі В.М. Мельнікоўская выводзіць з латэнскіх старажытнасцей Заходняй Еўропы, дзе датуюцца падобныя вырабы 4–3 стст. да н. э. [11, с.80]; матыў супрацьлегла загнутай спіралі шырока распаўсюджаны ў высоцкай культуры. Падобныя вырабы былі знойдзены каля в. Падгорцы.

Але ў цэлым датаванне тыпа такіх бранзалетаў неабходна суадносіць з 4–3 стст. да н. э.

**Тып 6.** Спіральныя бранзалеты. Даволі цікавы выраб быў знойдзены на гарадзішчы Халапенічы. Гэты бранзалет захаваўся фрагментарна. Ад упрыгожвання засталося два буйных фрагмента і шэраг мелкіх, ён быў выраблены з асобных бронзавых пласцінак шырынёй 0,5–0,6см, аб'яднаных разам, характар мацавання не зразумелы, магчыма, сварка.

Аналогіі гэтаму экземпляру не вядомы [5, с.70–71, рис.1:8].

**Тып 7.** Пласцiністыя рабрыстыя бранзалеты. Такія вырабы былі выяўлены на могільніку 6–8 стст. н. э. каля в. Нача. Вырабляліся яны з тонкага шырокага бронзавага ліста з рабрыстым зломам [4, с.68,149, рис.55:7]. Акрамя ўжо згаданых вырабаў на тэрыторыі Беларусі такія бранзалеты сустракаюцца ў курганным могільніку 8–9 стст. каля в. Рудня і курганным могільніку 10–12 стст. у Бельчыцах-4 [8, с.175, мал.I:9, с.183,195, мал.VI:33].

У Эстоніі на могільніку ў Котхла-Ярве знойдзены бранзалеты, якія вырабляліся з шырокай пласціны і перагнутай у сярэдняй частцы. Блізкія да такіх форм бранзалеты пачынаюць ужывацца тут з 3 па 5–6 стст. н. э. Але асабліва часта яны сустракаюцца ў 6 ст. н. э. [18, рис.24,5]. Падобны выраб быў зафіксаваны на могільніку Генчяй I і прадатаваны суправаджаючым пахавальным інвентаром 8–9 стст. н. э. [1, p.222, pav.8:5].

Храналогія тыпу рабрыстых бранзалетаў характарызуецца наступнымі асаблівасцямі. Відавочна, што узнікненне падобнай формы ўпрыгожванняў неабходна звязваць з эстонскімі помнікамі, дзе канчатковае станаўленне гэтай катэгорыі знаходак адносіцца да 6 ст. Далейшае распаўсюджванне такіх вырабаў на тэрыторыі Прыбалтыкі адбываецца на працягу 6–8 стст. На тэрыторыю Беларусі падобныя ўпрыгожванні трапляюць у 8–9 стст. На такую храналогію наводзяць вырабы з могільнікаў Рудня і Нача. Пахаванне з апошняга, у якім быў выяўлены рабрысты бранзалет, такім чынам неабходна адносіць па канца існавання могільніка, а, менавіта, да 8 ст. Існаванне дадзенага тыпу ўпрыгожванняў працягвалася фактычна да 12 ст.

**Тып 8.** Бранзалеты трохвугольнага сячэння з несамкнутымі канцамі. На гарадзішчы Чаплін быў знойдзены фрагмент такога бранзалета. Сам выраб прадстаўляў сабою масіўнае ўпрыгожванне. Шырыня бронзавай трохвугольнай пласціны дасягала 1,4 см [15, с.36, рис.20:30]. Ацалелы фрагмент не арнаментаваны.

Найбольш блізкія аналогіі былі знойдзены на пшэворскім могільніку Неданава. Гэта быў бронзавы выраб падавальнай формы 5,5 на 6,8см. Датуецца ён на гэтым могільніку фазай B1b [2, s.51, taf.LXXXIII/257:5]. Такім чынам і датаванне тыпу бранзалетаў трохвугольнага сячэння неабходна адносіць да часу 1 ст. н. э.

Такім чынам, у развіцці гэтай катэгорыі знаходак можна вылучыць тры культурныя ўсплескі. Першы адносіцца да 5–4 стст. да н. э., другі расцянуўся ў межах 2 ст. да н. э. – 1 ст. н. э., трэці – 5–6 стст. н. э.

## Літаратура


1. *Simniškté A.* Geriamieji rogai Lietuvoje // Lietuvos archeologija. Vilnius, 1998. T.15.
2. *Ziemlińska-Odojowa W.* Niedanowo. Ein Gräberfeld der Przeworsk- und Wielbark-Kultur in Nordmasowien // Monumenta archaeologica Barbarica. Kraków, 1999. T.VII.
3. *Бажан И. А., Каргопольцев С. Ю.* В-образные рифлёные пряжки как хронологический индикатор синхронизации // КСИА (Краткие сообщения института археологии). М., 1989. Вып. 198.
4. *Гуревич Ф. Г.* Древности Белорусского Понеманья. М.-Л., 1962.
5. *Егорейченко А. А.* Раскопки городища у д. Холопеничи // Древности Белоруссии и Литвы: (Сб. статей). Мн., 1982.
6. *Звяруга Я. Г.* Беларускае Павілле ў жалезным веку і раннім сярэднявякоўі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мн., 2005. Вып. 10.
7. *Кухаренко Ю. В.* Могильник Брест-Тришин. АН СССР. М., 1980.
8. *Ляўданскі А. Н.* Археолёгічныя доследы ў Полацкай акрузе // Працы археолёгічнай камісіі. Мн., 1930. Том. II.
9. *Максимов Е. В.* Зарубинецкая культура на территории УССР. Киев, 1982.
10. *Медведев А. М.* Белорусское Понеманье в раннем железном веке (1 тыс. до н. э. – 5 в. н. э.) / Ин-т истории НАН Беларуси. Мн., 1996.
11. *Мельниковская О. Н.* Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967.
12. *Митрофанов А. Г.* Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв. до н. э. – VIII в. н. э.). М., 1978.
13. *Мядзведзеў А. М.* Раскопкі гарадзішча каля в. Краснае // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мн., 2003. Вып. 7.
14. *Петренко В. Г.* Украшения Скифии VII-III вв. до н. э. // САИ. 1978. Вып. Д4-5.
15. *Поболь Л. Д.* Славянские древности Белоруссии (ранний этап зарубинецкой культуры). АН БССР, Ин-т истории. Мн., 1971.
16. *Шадыра В. І.* Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.). Мн., 2006.
17. *Шадыро В. И.* Ранний железный век северной Белоруссии. Мн., 1985.

18. *Шмидельхельм М. Х.* Археологические памятники периода разложения родового строя на северо-востоке Эстонии (V в. до н. э. – V в. н. э.). Таллинн, 1955.

## МОДЕЛЬ ЭТНИЧЕСКОГО КОНФЛИКТА

**И. Г. Бочило, С. А. Захаркевич**

Межгрупповые отношения внутри любого общества, государства представляют собой систему, включающую как сотрудничество, так и конфликты. В настоящее время процессы межгруппового взаимодействия по ряду причин стали определяться именно вторыми. До XX века конфликты находили отражение в непрерывных революциях, религиозных столкновениях. На современном этапе роль дестабилизирующего фактора все увереннее стали приобретать этнические конфликты. Между 1955 и 1996 гг. в мире было 239 войн, смен режима, актов геноцида, в числе причин которых были именно межэтнические конфликты [3, с.47]. В период с 1980 по 1996 год шестьдесят этнических и религиозных меньшинств стали жертвами войны и политики преследования [3, с.48]. Всплеск столкновений на этнической почве заставил задуматься мировую общественность: недаром ООН назвала этнические конфликты основной формой войн XXI века [6, с.232].




*Рис.* Модель этнического конфликта

Противостояния на этнической почве имеют сложный, противоречивый и нередко долговременный характер. В связи с этим